ле. — 2000. — №2. — С. 3–10.

Приложение

**QR-код доступа к информационному ресурсу проекта**

*Дата поступления в редакцию: 30.05.2025*

# ПЛАН-КАНСПЕКТ ІНТЭГРАВАНАГА ЎРОКА[1] ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ "БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА", "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ" Ў Х КЛАСЕ ПА ТЭМЕ "НА ВАЙНЕ І ПРА ВАЙНУ" (АГЛЯД ЛІРЫКІ А. КУЛЯШОВА ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ)[2]

*Шантарэнка Вольга Генадзеўна*
*Радзевіч Алена Стэфанаўна*

**Мэта:** дасягнуць усведамлення драматызму гістарычных падзей Вялікай Айчыннай вайны пры дапамозе міжпрадметных сувязяў на аснове тэхналогіі крытычнага мыслення.

**Задачы:**

стварыць спрыяльныя ўмовы для асэнсаванага знаёмства з творчасцю і жыццёвым шляхам А. Куляшова на фоне гістарычных падзей праз інтэграцыю ВУНаў па гісторыі і беларускай літаратуры;

садзейнічаць развіццю крытычнага мыслення праз аналіз вершаў ваеннага часу, самыя яскравыя прыклады ваеннай лірыкі пісьменніка, знайсці сувязь мастацкага твора і гістарычнай асновы сюжэта;

спрыяць выхаванню патрыятычнага пачуцця, актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў вучняў.

**Абсталяванне:** партрэт А. Куляшова; фотаздымкі падзей Вялікай Айчыннай вайны; мультымедыйная прэзентацыя «Жыццё А. Куляшова»; фоназапіс голаса Левітана, запіс песняў «Жураўлі», «Священная война»; схематычны і тэарэтычны матэрыял; карта-схема; гістарычныя даведкі.

## Ход урока

**І. Арганізацыйны момант.**

*Фарміраванне груп: вучні дзеляцца на групы ў залежнасці ад выбранага верша А. Куляшова (творчая група вызначана настаўнікамі); настаўнікі паведамляюць алгарытм ходу ўрока.*

**ІІ. Выклік.**

*Вучням прапануецца самім вызначыць тэму ўрока з асацыятыўнага раду слоў, размешчаных на дошцы.*

**Настаўнік гісторыі.** Звярніце ўвагу на змешчаныя на дошцы словы. Абмяркуйце ў групах, а потым агучце, пра што пойдзе гаворка сёння на ўроку.

*Выбар, здрада, «Баграціён», калабаранты, генацыд, Хатынь, сведка, акупацыя, подзвіг, Марыненка, ахвяра, 3 ліпеня 1994 года, Перамога, гуманізм.*

*Вучні раюцца, выказваюць свае думкі, абгрунтоўваючы іх.*

**Настаўнік літаратуры.** Прыведзеныя словы-асацыяцыі, як вы заўважылі, ужываюцца ў розных стылях маўлення, маюць розныя значэнні, але аб'яднаны агульным словам вайна.

**Настаўнік гісторыі.** Тэма нашага сённяшняга ўрока «На вайне і пра вайну», бо без мінулага няма будучыні.

**Настаўнік гісторыі.** Эпіграф да ўрока — радкі В. Быкава «Да таго часу, пакуль людзі будуць помніць жахі мінулай вайны, вайна не павінна паўтарыцца».

**Настаўнік літаратуры.** Вялікая Айчынная вайна вызначыла месца і прызначэнне кожнага. Адны змагаліся на перадавой, другія — у тыле ворага, уносячы свой непамерны ўклад у барацьбу з фашысцкімі захопнікамі. З першых дзён вайны пісьменнікі, паэты разам з народам ішлі на барацьбу з фашызмам. Іх зброяй былі і вінтоўка, і кулямёт, і мастацкае слова: вершы, апавяданні, песні, радкі ваеннай карэспандэнцыі.

[1]Урок разлічаны на 90 хвілін: арганізацыйны момант, выклік — 10 хвілін; стадыя асэнсавання — 40 хвілін; стадыя рэфлексіі — 30 хвілін; падвядзенне вынікаў урока — 10 хвілін.

[2]Форма правядзення нестандартная, што дае магчымасць вучням выкарыстаць веды па адным прадмеце для вывучэння другога на аснове тэхналогіі крытычнага мыслення. Прапанаваныя віды працы падтрымліваюць увагу вучняў, павышаюць пазнавальную цікавасць, служаць развіццю ўяўлення, творчай актыўнасці. Знаходкі ўрока могуць выкарыстоўвацца як асобны матэрыял для правядзення факультатыўных заняткаў, пазакласнай работы па прадметах і ў даследчай працы.

З лёсам і творчасцю аднаго з ваенных карэспандэнтаў пазнаёмімся сёння на ўроку.

***Вучань 1*** *прадстаўляе прэзентацыю "Лёс Аркадзя Куляшова даваеннага і ваеннага перыяду".*

*Гучыць песня «Священная война» В.І. Лебедзева-Кумача і А. Александрава.*

***Вучань 2*** *чытае ўрывак з паэмы А. Куляшова «Сцяг брыгады» (Родны Мінск я пакінуў...).*

*Гучаць словы Ю. Левітана «Ад савецкага інфармбюро...»*

***Вучань 3*** *прадстаўляе гістарычную даведку пра першыя дні акупацыі ў горадзе Мінску (дадатак 7).*

**Настаўнік гісторыі.** Штодзённай чырвонаармейскай газеце патрэбны быў аператыўны матэрыял, які па гарачых слядах асвятляў бы ход баявых дзеянняў, вучыў байцоў ваяваць і перамагаць грознага ворага. Такой мэце служылі і рыфмаваныя лозунгі, і вершы-наказы, і чарговыя сведкі савецкага інфармбюро, і разнастайныя сатырычныя творы. Часцей за ўсё яны пісаліся з канкрэтнай прычыны, і героі іх не выдуманыя, а рэальныя асобы. Аб справах гэтых салдат і афіцэраў ведалі, вядома, іх таварышы па ўзводзе, роце, іх прыкладам, які знайшоў водгук у газеце, ганарыліся і пераймалі яго. Прыкладам газет ваеннага часу з'яўляюцца «Раздавім фашысцкую гадзіну», «За свабодную Беларусь», якія вы можаце ўбачыць на дошцы.

**Настаўнік літаратуры.** За аснову шматлікіх сваіх твораў Аркадзь Куляшоў узяў рэальныя гістарычныя ваенныя падзеі. Сёння мы пазнаёмімся з найбольш яскравымі творамі пісьменніка ваеннага часу. Гэта вершы «Камсамольскі білет», «Над брацкай магілай», «Балада пра чатырох заложнікаў».

**III. Асэнсаванне.**

**Настаўнік літаратуры.** Прачытаем твор, які не страціў актуальнасці і да нашага часу, з'яўляецца яскравым прыкладам мужнасці і стойкасці беларускіх камсамольцаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

***Вучаніца 1*** *чытае верш «Камсамольскі білет».*

<u>Праца ў групах. Прэзентацыя груп.</u>

*Вучні ўважліва слухаюць і занатоўваюць інфармацыю ў сшытку.*

***Вучань 4*** *выступае з гістарычнай даведкай пра дзейнасць камсамола ў часы Вялікай Айчыннай вайны (дадатак 10).*

**Група 1.** Аналіз верша (дадатак 2, дадатак 4). Ацэнка групы (дадатак 1).

***Вучань 5*** *выступае з гістарычнай даведкай пра партызанскі рух на Беларусі (дадатак 8).*

**Настаўнік гісторыі.** Зброяй пісьменнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны былі не толькі вершы, але і больш складаныя ліра-эпічныя жанры: балады, паэмы. Зараз слова вучням з другой групы, якія пазнаёмяць нас з «Баладай пра чатырох заложнікаў». У аснову гэтага твора былі пакладзены рэальныя гістарычныя падзеі, звязаныя з іменем бацькі Міная.

***Вучаніца 2*** *выступае з гістарычнай даведкай пра дзейнасць бацькі Міная (дадатак 9).*

***Вучань 6.*** *Чытае выразна баладу.*

**Група 2.** Аналіз верша (дадатак 2, дадатак 5). Ацэнка групы (дадатак 1).

**Настаўнік гісторыі.** В. Быкаў казаў: «На вайне не бывае без смярцей — адна з мэт любой вайны не толькі захоп тэрыторый, але і забойства людзей, якія стаяць на варце сваёй зямлі». Людскія страты на тэрыторыі Беларусі ў часы Вялікай Айчыннай вайны па архіўных дадзеных складаюць 2 596 676 чалавек, з іх ваеннаслужачых у баях — 332 568 чалавек, ваеннапалонных у лагерах — 810 091 чалавек, партызан і падпольшчыкаў — 44 791 чалавек, мірнага насельніцтва — 1 409 225 чалавек. Як вы разумееце, страты сярод мірнага насельніцтва былі самымі значнымі.

*Гучыць песня «Жураўлі» Я.А. Фрэнкеля, Р.Г. Гамзатава, Н.І. Грэбнева, на фоне якой вучаніца паведамляе пра брацкія магілы.*

**Група 3.**

***Вучаніца 3*** *чытае верш А. Куляшова «Над брацкай магілай».*

Аналіз верша (дадатак 2, дадатак 4). Ацэнка групы (дадатак 1).

**Група 4.** Складзіце хайку, выканайце заданне на карце-схеме (дадатак 3, дадатак 6).

**IV. Рэфлексія.**

*Настаўнік літаратуры чытае словы В. Быкава: «Мабыць найбольшае зло ў жыцці чалавека — спрадвечнае яго бяспамяцтва».*

Ці згодныя вы з выказваннем В. Быкава? Свае меркаванні можна аформіць праз "Групавы прагноз" (табліца).

| Спрадвечнае бяспамяцтва — зло ў жыцці чалавека? | |
|---|---|
| ТАК | НЕ |
| ………<br>………<br>……… | ………<br>………<br>……… |
| Вынік: …………. | |

Табліца

**Настаўнік гісторыі.** Ніхто не забыты, нішто не забыта. Гэтыя словы ў свядомасці і сэрцах не толькі людзей старэйшага пакалення, але і іх дзяцей, унукаў, праўнукаў, якія не ведалі вайны. Неабходна засцерагаць нашы душы ад самага большага зла ў жыцці чалавека — спрадвечнага бяспамяцтва.

*Настаўнік літаратуры прапануе ўшанаваць памяць загінуўшых на вайне хвілінай маўчання.*

*Гучыць метраном.*

**V. Падвядзенне вынікаў урока.**

Сёння на ўроку я прыйшоў(ла) да высновы...

<u>Дамашняе заданне</u> — напісаць эсэ на тэму «Асоба Аркадзя Куляшова».

Дадатак 1

**Ацэнка групы**

Абазначце, як вы ацэньваеце работу групы:

□ мы ўпэўніліся ў тым, што члены нашай групы зразумеюць заданне;

□ мы выслухалі думкі і прапановы ўсіх членаў групы;

□ мы цярпліва высвятлялі ў групе больш складаны матэрыял;

□ мы размеркавалі работу ў групе;

Што вашай групе ўдавалася асабліва добра?

Што б вы зрабілі па-іншаму ў наступны раз, каб больш паспяхова супрацоўнічаць? Растлумачце падрабязна.

Дадатак 2

| Назва верша | | |
|---|---|---|
| Параметры | Меркаванні вучняў | Доказ меркаванняў, прыклады |
| 1. Тэма<br>2. Ідэя твора<br>3. Від лірыкі<br>4. Вершаваны памер<br>5. Мастацкія сродкі:<br>*эпітэт<br>*метафара<br>*параўнанне<br>6. Мастацкія асаблівасці:<br>*пейзаж<br>*гукапіс<br>*рыфма<br>*будова<br>*элемент фальклору<br>*кантраснасць<br>*дакументальнасць<br>7. Уласнае стаўленне да верша | | |

Дадатак 3

**Складаем «Хайку»**

Хайку (хокку) — гэта японская вершаваная форма ў тры радкі:
радок 1 павінен змяшчаць фразу з пяц складоў;
радок 2 павінен змяшчаць фразу з сямі складоў;
радок 3 павінен змяшчаць фразу з пяці складоў.

Дадатак 4

| Назва верша | Мастацкія сродкі | Прыклады |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| | | |

Дадатак 6

1. Адзначце на карце-схеме, карыстаючыся сваім смартфонам, жыццёвыя дарогі пісьменніка А. Куляшова. Спасылка для працы:

2. Складзіце хайку (дадатак 3).
3. Напішыце эсэ "Асоба Аркадзя Куляшова".

Дадатак 7

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА. ЗАХОП МІНСКА НЯМЕЦКАЙ АРМІЯЙ

22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія вераломна напала на СССР. Пачалася Вялікая Айчынная вайна савецкага народа, якая стала састаўной часткай Другой сусветнай вайны. 22 чэрвеня 1941 г. паміж 3:00 і 3:30 нямецкая армія (вермахт) перасякла мяжу з СССР. У Заходняй асобнай ваеннай акрузе паветраным налётам падвергліся 26 аэрадромаў, і ў першыя дні вайны былі страчаны 738 самалётаў (41%). Раніцай 22 чэрвеня праціўнік перайшоў у наступленне сіламі групы армій «Цэнтр» (камандуючы Ф. фон Бок). Першымі ў бой з перадавымі нямецкімі часцямі ўступілі савецкія пагранічнікі, маючы толькі стралковую зброю, яны аказалі зацятае супраціўленне. Пад вечар

22 чэрвеня ўзнікла пагроза глыбокага ахопу нямецкімі танкавымі злучэннямі абодвух флангаў Заходняга фронту.

24 чэрвеня, калі асноўныя сілы 3-й танкавай групы пасля захопу Вільнюса рушылі да Мінска, напрамак Вільнюс — Мінск апынуўся амаль непрыкрытым. Таму дывізіям, сканцэнтраваным у Мінску, было загадана тэрмінова заняць абарону Мінскага ўмацаванага раёна. Раніцай гэтага дня пачаліся масіраваныя бамбардзіроўкі Мінска: былі выведзены са строю электрычнасць і вадаправод, спыніліся трамваі, перасталі працаваць хлебазавод і магазіны.

Баі на подступах да Мінска былі кравапралітныя і хуткія. Да 28 чэрвеня пераважаючым сілам ворага процістаялі разрозненыя, абяскроўленыя часці і падраздзяленні з армій прыкрыцця, механізаваныя і пяхотныя карпусы і дывізіі 13-й арміі пад камандаваннем П. М. Філатава. У абароне Мінска прымала ўдзел 100-я стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра І.М.Русіянава, якая праз два месяцы стала першай гвардзейскай у Чырвонай Арміі. Абаронцы сталіцы ўпершыню ў гады вайны выкарысталі так званую «шкляную артылерыю». Гэта бутэлькі з гаручай сумессю для барацьбы з танкамі. На Захадзе іх празвалі «кактэлем Молатава». 28 чэрвеня ў 17 гадзін нямецкія танкі і мотапяхота ўварваліся ў Мінск. Праз суткі нямецкія войскі замкнулі чарговы «кацёл» вакол дывізій Заходняга фронту, што абаранялі Мінск. Нягледзячы на ўпартае супраціўленне, ужо на шосты дзень вайны фашысты захапілі Мінск.

Дадатак 8

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА. ПАРТЫЗАНСКІ РУХ НА БЕЛАРУСІ

У пачатку вайны пад кіраўніцтвам КП(б)Б ствараліся і разгортвалі свае дзеянні партызанскія атрады. Ужо на пяты дзень вайны ў Пінскім раёне быў сфарміраваны адзін з першых партызанскіх атрадаў у Беларусі, які ўзначальваў Васіль Захаравіч Корж. У першыя дні вайны ў Кастрычніцкім раёне Палескай вобласці быў створаны партызанскі атрад «Чырвоны Кастрычнік», які ўзначаліў Ціхан Бумажкоў, а потым Фёдар Паўлоўскі. Ім першым з савецкіх партызан 6 жніўня 1941 г. было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Дадатак 9

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА. ДЗЕЙНАСЦЬ БАЦЬКІ МІНАЯ

У ліпені 1941 г. быў створаны партызанскі атрад пад кіраўніцтвам Міная Піліпавіча Шмырова, які атрымаў у партызан мянушку Бацька Мінай. Пасля некалькіх няўдалых спроб знішчыць партызан, германскія акупанты захапілі ў якасці заложнікаў чатырох дзяцей Бацькі Міная і патрабавалі ад яго здацца ў палон у абмен на выратаванне дзяцей. Рашэнне Бацькі Міная не было лёгкім і простым, за свой патрыятычны выбар ён заплаціў жыццём дзяцей, але партызаны адпомсцілі акупантам за іх.

15 жніўня 1944 г. Шмырову Мінаю Піліпавічу было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Некалькі партызанскіх атрадаў (у тым ліку і атрад М. П. Шмырова) уступілі ў непасрэднае ўзаемадзеянне з войскамі Калінінскага фронту, якія выйшлі да граніцы Беларусі на Віцебскім нарамку. Сумеснымі намаганнямі па лініі фронту быў утвораны 10-кіламетровы праход, які існаваў у лютым — верасні 1942 г., так званыя Суражскія (Віцебскія) «вароты». Яны дазволілі перадаць партызанам неабходнае ўзбраенне і ўстанавіць апаратыўную сувязь з савецкім камандаваннем.

Дадатак 10

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАВЕДКА. ДЗЕЙНАСЦЬ КАМСАМОЛЬЦАЎ
У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны сотні тысяч камсамольцаў уключыліся ва ўсенародную барацьбу з нямецка-фашысцкімі акупантамі. За гады вайны ў войска і на флот было адпраўлена звыш 3,5 млн камса-

мольцаў. Асобныя партызанскія атрады і падпольныя арганізацыі амаль цалкам складаліся з камсамольцаў і моладзі. Ордэнамі і медалямі было ўзнагароджана 50 тыс. маладых партызан, звыш 100 чалавек сталі Героямі Савецкага Саюза.

Падполле ў Мінску восенню 1941 г. узначаліў сакратар Мінскага падпольнага гарадскога камітэта КП(б)Б Іван Казінец. Па заданні кіраўніцтва Мінскага падполля здабываў зброю і боепрыпасы, ратаваў людзей з лагераў смерці Іван Кабушкін. Група Мікалая Кедышкі распаўсюджвала лістоўкі, арганізоўвала пабегі ваеннапалонных, здзяйсняла дыверсіі на Мінскіх прадпрыемствах.

Мінскія падпольшчыкі ў 1942 г. сваю ўвагу засяродзілі на масаваагітацыйнай рабоце сярод жыхароў горада, сістэматычных дыверсіях на розных аб'ектах, зборы для партызан разведвальных звестак, вызваленні ваеннапалонных і патаемнай адпраўцы іх у лес да партызан. Падпольшчыкі выпускалі газету «Звязда», лістоўкі, мелі сувязь з падполлем іншых гарадоў. У складзе мінскага падполля самааддана змагалася звыш 9 тыс. чалавек. За час акупацыі ў Мінску было праведзена звыш 1500 дыверсій.

У Віцебску ў 1941–1942 гг. дзейнічала 56 падпольных груп. Адной з іх з кастрычніка 1942 г. кіравала Вера Харужая, якая была схоплена немцамі і закатавана. В. Харужай было прысвоена пасмяротна званне Героя Савецкага Саюза.

Падпольная камсамольская арганізацыя «Юныя мсціўцы» на чыгуначнай станцыі Обаль Віцебскай вобласці была створана вясной 1942 г. Маладыя падпольшчыкі зрабілі 21 дыверсію. Амаль усе падпольшчыкі былі арыштаваныя і пакараныя смерцю.

За подзвігі ў гады Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, а таксама за поспехі ў сацыялістычным будаўніцтве ВЛКСМ быў узнагароджаны шасцю ордэнамі: ордэнам Чырвонага Сцяга (1928 г.), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1931 г.), трыма ордэнамі Леніна (1945 г., 1948 г., 1956 г.), ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі (1968 г.).

*Дата поступления в редакцию: 30.05.2025*